# Памыляцца і быць збаўленым:
*пра каталіцкае разуменьне няскончанай гісторыі нашага збаўленьня*

Джэймс Алісан

“Ты збаўлены?” – Такое пытаньне можа раздражняць, бо мае наўвазе просты адказ: так ці не. Але многія адказаць адназначна, станоўча ці адмоўна, не змаглі б. Такая няпэўнасьць – верны знак для таго, хто запытаўся, што сапраўдны адказ – не. Каталікам у прынцыпе складана разважаць пра збаўленьне, калі пытаньне пра яго зводзіцца да магчымасьці адказаць толькі так або не, бо каталіцкае разуменьне збаўленьня, вытканае Хрыстом, сутнасна зьвязанае з прыналежнасьцю да Царквы (але і не атаесамляецца толькі зь ёю). Таму каталікам было б някепска аднайсьці наноў сьмеласьць і здольнасьць гаварыць пра збаўленьне.

Праблема з пытаньнем пра “збаўленасьць” некага як неаспрэчную дадзенасьць заключаецца ў тым, што яно прымушае нас казаць пра нашую гісторыю як пра завершаную, без далейшага працягу. Калі мы кажам: “Так, я збаўлены,” – то няма ‘рэшты гісторыі’. Гэта значыць, што пасьля станоўчага “так, збаўлены” нашае жыцьцё – як тая п’еса, дзе разьвязка відавочная ўжо ў першым акце, а ўсё астатняе – неістотны баласт. І, канешне, мы тады ня маем сюжэтнае лініі, якое трэ’ было б трымацца, разблытваць старанна і ўважліва – або со страхам і трапятаньнем – цягам усяго нашага жыцьця.

Думаю, аднак, што ўваскрасеньне Хрыста дазваляе нам пабачыць іншую няскончаную гісторыю і пачаць стваральную лепку таго, кім мы павінны стаць. Гэта гісторыя зь ненапісаным фіналам, чыё завярэньне мы ня можам і не павінны спрабаваць прадвызначыць.

## Брак разуменьня

Незадоўга перад сьмерцю Ісус дыскутаваў зь некалькімі садукеямі пра ўваскрасеньне, у якое тыя ня верылі. Яны задалі яму пытаньне пра сямёх братоў, якія памерлі адзін за адным і, адпаведна з законам Левірату, перадавалі адзін другому жонку першага, нібы тая была б патрыманым самаходам. “Чыёй жонкай яна будзе пасьля ўваскрасеньня?” – Пытаньне больш зьмястоўнае, чым можа здавацца адразу, бо сваё веданьне Бога садукеі грунтавалі выключна на першых пяцёх кнігах Бібліі, напісаных, паводле садукеяў, Майсеем. Калі было б уваскрасеньне, то Бог напэўна сказаў бы пра яго Майсею, свайму сябру. Але Майсей нічога не казаў пра ўваскрасеньне, затое абвясціў Левірат. Гэты закон дазваляў братам замяшчаць свайго памерлага брата дзеля нараджэньня патомства, калі той не пакінуў пасьля сябе дзіця. Гэта вымоўнае сьведчаньне мэнтальнасьці, паводле якое бясконцасьць жыцьця сьмяротнага стварэньня заключаецца ў яго нашчадках.

Ісус катэгарычна адмаўляецца адказваць на пытаньне садукеяў. “Ці не таму вы памыляецеся, што ня ведаеце пісаньняў, ані сілы Божай? – Рытарычна запытваецца і напрыканцы зноў ім кажа, – вы моцна памыляецеся.” Ён цытуе Пяцікніжжа, каб паказаць, што Бог абсалютна жывы, бязь ценю сьмерці, а значыць і тыя, хто жывыя ў Богу – нават калі памерлі, як Абрагам, Ісаак і Якуб былі ўжо памерлыя ў часы Майсея, – маюць жыцьцё ў Ім. Больш за тое: бясконца-стваральная сіла Бога не патрабуе чалавечае рэпрадукцыі, каб

падтрымліваць нас у існаваньні, бо Бог здольны ствараць бясконца разнастайных людзей – гэтак жа, як Ён стварае анёлаў, кожнага свайго роду, якія не нараджаюць іншых. Адказваючы садукеям, Ісус сьцьвярджае, што памылковаць іх мысьленьня вынікае зь недастатковага, з павярхоўнага разуменьня Бога. Яны "памыляюцца", бо недастаткова спазналі Бога як невычарпальную крыніцу бясконцага жыцьця.

Можна ўявіць сабе захопленасьць вучняў Ісуса перамогай настаўніка над садукеямі – уплывовай групай пры ўладзе. Было б шкада, аднак, калі б мы спыніліся на гэтым, тым самым зводзячы дыскусію аб разуменьні Бога толькі да прыняцьця таго ці іншага боку, трапляючы ў пастку памылковага *ad hominem* разважаньня. Адказ Ісуса – хутчэй сьцьвярджэньне таго, што ня толькі садукеі, але ўсе мы моцна памыляемся, што ўсе мы павярхоўна разумеем бязьмерную жыцьцядайнасьць Бога. Нам усім уласьціва бачыць Яго як Бога, зьвязанага абставінамі нашага быцьця на зямлі і пранізанага наскрозь сьмерцю.

Спрэчка Ісуса з садукеямі адбылася незадоўга да Яго ўкрыжаваньня і яе зафіксавалі ўсе тры сінаптычныя Эвангельлі. Яна – важнае сьведчаньне таго, як Ісус разумеў Бога перад сваёй сьмерцю. Бог для Яго цалкам па-за сьмерцю, абсалютна па-за ўсімі працятымі сьмерцю элемэнтамі чалавечага жыцьця. Эвангельле ад Яна, асабліва ў 14-17 разьдзелах, паказвае, што галоўнай мэтай усяго, што рабіў Ісус, было менавіта *стварыць веру* ў несьмяротную і выключна любячую прыроду Бога. Адзіным спосабам стварыць такую веру, стварыць магчымасьць, каб іншыя маглі ўбачыць у Богу таго, хто цалкам па-за абсягам сьмерці, было дазволіць быць забітым людзьмі гвалту. Такі ствральны акт мог быць задуманы і зьдзейснены тым, хто сам ведаў, што Божая жыцьцядайнасьць і любоў непадначаленыя сьмерці, і што для таго, каго любіць Бог, сьмерць ня ёсьць завяршэньнем усяго. Ісус мог ахвяраваць жыцьцём, хоць і ня быў прываблены сьмерцю; Ён не ўцякаў ад яе, але й ня быў палонены мазахісцкім жаданьнем самамучаніцтва. Пра гэта сьведчыць Эвангеліст Ян, калі ў вусны Хрыста ўкладае фразу "Я іду да свайго Айца" як сінонім да "Я іду памерці".

### Новая форма быцьця чалавекам

Веданьне і разуменьне Бога як ведаў і разумеў Яго Ісус – гэта шлях да новае формы быцьця чалавекам, калі сьмяротнае стварэньне становіцца здольным жыць без і па-за страхам сьмерці і такім чынам знаходзіць вызваленьне да ствральнага і справядлівага быцьця. Таму Ісус рыхтаваў сваіх вучняў сьледаваць таму, што ў Ім стала рэчаіснасьцю. Вучняў, якія маглі б зразумець, што Бог ня мае ніякага дачыненьня да чалавечага гвалту і сьмерці; якія маглі б пачаць ствараць пачатак альтэрнатыўнае чалавечае культуры, свабоднай ад элемэнтаў сьмерці. Безумоўна, Ён ня мог выбраць нейкіх адрозных ад нас людзей – чыё ўяўленьне, палоненае сьмерцю, скіраванае ў нішто, якія выбіраюць несправядлівасьць, калі справядлівасьць нясе з сабой рызыку сьмерці. Ён ня мог сьпяшацца з гэтымі людзьмі, такімі ж самымі, як мы, хто не разумеў сутнасьці Яго намаганьняў: як людзі, зьняволеныя сьмерцю, могуць прыняць альбо сьледаваць ідэі, галоўны прынцып якое – неканчатковасьць сьмерці? Вучням, якія радаваліся перамозе Ісуса над садукеямі, наўрад ці менш бракавала разуменьня Божае любячае жыцьцядайнасьці, чым пераможаным садукеям.

Ісус ведаў гэта вельмі добра і таму разумеў, што толькі пасьля Ягонае сьмерці, зь Яго вяртаньнем ва ўваскрасеньні і спасланьнем Сьвятога Духа ўяўленьне вучняў пераменіцца настолькі, што яны здолеюць пабачыць намеры

свайго настаўніка. Настолькі, наколькі гэтае ўяўленьне будзе перамененае, яны здолеюць стваральна імітаваць Яго самаадданьне, чаму ўжо скандал сьмерці ня будзе перашкодай.

**Вялізарны культурны зрух**

У гэтым кантэксьце мы можам зразумець, *што* мы сьвяткуем, калі сьвяткуем Уваскрасеньне. Вяртаньне Ісуса да сваіх вучняў было пачаткам вялізарнага культурнага зруху, які адначасова нарадзіў цалкам новае разуменьне Бога і цалкам новае разуменьне чалавека. Апосталы пачалі разумець, што Бог ня мае ніякага дачыненьня да чалавечага гвалту або да сацыяльнага парадку, заснаванага на людзкім гвалце. Хутчэй, Бог знаходзіцца настолькі абсалютна па-за гэтым парадкам, што Ён здольны перамяніць яго знутры, стаўшы ахвярай тыповага акту людзкога гвалту, лінчаваньня – салідарнасьці ўсіх супраць аднаго, найбольш вінаватага і стваральніка праблемаў, – ператварыўшы гэта ў сьведчаньне, у адкрыцьцё, кім Бог насамрэч ёсьць. Ён – не арганізуючы прынцып людзкога ладу, ня прынц гэтага сьвету, але абсалютна дабрадзейны стваральнік вызваленьня ад парадку гэтага сьвету. Ён – дабраахвотная ахвяра, хто прабачае сваім перасьледвальнікам і тым самым стварае магчымасьць для фармаваньня безахвярнага соцыюму. Божая дабрыня нам адкрытая не як прыняцьце Богам нейкага аднаго людзкога ахвярапрынашэньня, каб прыхаваць наш гвалт, а як перамяненьне знутры ўсяго нашага ілжывага парадку, які трымаецца на ахвярах, – аддаўшы нам сябе як ахвяру, каб мы больш ніколі ня мелі патрэбы ствараць наш лад на ахвярапрынашэньні.

Адначасна з такім разуменьнем Бога зьявілася цалкам новае і надзвычай радыкальнае і страшнае ўсьведамленьне таго, хто мы такія. Мы – стварэньні, чый сацыяльны лад грунтуецца на скажоным сьмерцю жаданьні бясьпекі за кошт ахвяраваў. Царква гэта назвала “першародным грахом”. Калі мы асацыюем гэтую дактрыну выключна з гісторыяй Адама і Эвы, мы ігнаруем апостальскае сьведчаньне. Апосталы пачалі разумець сутнасьць чалавека, які блытае безьсьмяротнасьць Бога зь сьмяротнасьцю чалавека і, такім чынам, робіць Бога вязьнем нашага гвалту – гвалту ня толькі Адама, але і Каіна, і Бабілёну. Апостал Павал кажа нам пра жаданьне Адама, скажонае і прагнае сьмерці. Апостал Ян паказвае, што нягдольныя пабачыць Бога, якім Ён ёсьць, мы становімся наступнікамі Каіна, чыё зайздроснае жаданьне – дадзенае яму бацькам маны і забойцам ад пачатку – прывяло яго да забойства брата і такім чынам запачаткавала тое, што Аўгустын назваў “зямным горадам”. Лука, калі гаворыць пра Пяцідзесятніцу, паказвае нам пачаткі новае ўнівэрсальнае чалавечае культуры як пераадоленьне Бабілёну – раўнівай чалавечай патрэбы абапіраць сваю тоеснасьць на супрацьпастаўленьні іншаму, што заўсёды вядзе да гвалтоўных падзелаў.

**Першародны грэх**

Разуменьне таго, кім чалавек насамрэч ёсьць, не прыйшло як нейкага кшталту абвінавачаньне чалавека, каб стварыць у ім пачуцьцё віны. Якраз наадварот. Такое разуменьне нараджаецца, калі становіцца магчымым пакінуць гэты стан і пачаць пераўтварэньне ў цалкам іншы кшталт чалавека – не кіраванага сьмерцю і ягонай сацыяльнай дынамікай. Уваскрасеньне Ісуса не было абвінавачаньнем, але рэалізацыяй стваральнага чалавечага прабачэньня, якое робіць магчымым пакінуць той шлях быцьця чалавекам, каторы можа быць

намі зразуметы толькі на шляху зь яго. Дактрына аб першародным граху – гэта разьвітальны позірк на неабавязковы характар таго, кім мы перастаем быць.

Дактрына аб першародным граху – далёка ня дзіўна закручаная царкоўная загадка. Хутчэй, гэта бачаньне суцэльнай падначаленасьці чалавека ўладзе сьмерці – бачаньне, якое цалкам вынікае з уваскрасеньня Ісуса. Гэта, я б сказаў, неабходны сродак, каб пачаць разумець, *што* Хрыстом дадзенае збаўленьне азначае, бо гэтая дактрына пра тое, што ўсе мы, дакладна як садукеі, моцна памыляемся, бо нашае ўяўленьне і ўспрыняцьце сфармаваныя структурамі гвалту, якія нараджаюцца з патрэбы бясьпекі, асягальнай з дапамогай сьмерці. Але гэта таксама дактрына пра тое, што мы зусім не абавязаныя быць такімі.

Яна вяртае нас да раней прыгаданае гісторыі пра збаўленьне, якую мы маглі б расказаць. Спрадвеку існавала шмат гісторыяў, скампіляваных і прыдуманых, дзе ключавым момантам былі адносіны да іншых. Гэта маглі быць аповеды пра перамогу над ворагамі, пра неразумнасьць і негуманнасьць іншаземцаў і гуманнасьць свайго народу. Усе такія гісторыі маюць адно заканчэньне – сьмерць. І ня проста сьмерцю яны заканчваюцца, але такога кшталту гісторыі – пра герояў ці ахвяраў – літаральна набрыняныя сьмерцю: яны заўсёды або пра тое, што нехта прыносіць сьмерць, каб застацца жыць, або пра тое, што нехта зьнішчаны некім, каб іншыя мелі жыцьцё.

Калі мы кажам пра збаўленьне, мы не расказваем гісторыю, якая мае заканчэньне. Мы гаворым пра нешта насамрэч немагчымае ўявіць, пра несканчальную гісторыю. Гэта тое, што ўваскрасеньне Хрыста зрабіла магчымым: пачаць ствараць сапраўдныя чалавечыя гісторыі, натхнёныя і ўзрошчаныя ўяўленьнем, скіраваным да несьмяротнасьці і жыватворнасьці Бога, якія могуць адрабіць манатонную людзкую гісторыю, сфармаваную сквапным жаданьнем і забойчай нецярпімасьцю. Гэта значыць, што нам дадзены сродак распазнаць наш саўдзел у старой гісторыі, пабачыць, як мы рыпліва гучалі нібы зацёртая плытка, і пачаць выкоўваць новую гісторыю – стваральна імітуючы гісторыю Ісуса.

Увесь сэнс гэтае гісторыі ў тым, што яна дадзеная нам не як ужо завершаная, але як нешта, што павінна быць створанае. І мы не пакінутыя з пустымі рукамі, без прыдатных знакаў, намёкаў, інтэлігентных правілаў – усяго, што мы называем Царквой. Калі Ісус сказаў: “Рабеце гэта на ўспамін аба Мне,” – Ён ня толькі ўстанавіў Эўхарыстыю, як падаюць сінаптычныя Эвангельлі, але Ён прывёў да быцьця гнуткую парадыгму стваральнага дзеяньня, бо прыказаньне: “Любеце адзін аднаго, як Я палюбіў вас. Ніхто ня мае любові большае за тую, калі хто аддасьць душу сваю за сяброў сваіх. Вы сябры Мае, калі спаўняеце тое, што я загадваю вам,” – па-сутнасьці тое ж самае, што і “рабеце гэта на ўспамін аба Мне”. Іншымі словамі, гэта значыць: дазволь сваім стваральным уяўленьням быць узрошчанымі на прыкладзе, які Я даю табе і які робіць магчымым веру ў абсалютную жывасьць Бога, каб ты мог рабіць тое, што Я раблю. Ты будзеш здольным ствараць гісторыю пераманеньня знутры таго парадку, на якім гэты сьвет будуе сваё адзінства: ты будзеш знаходзіць і далучаць свой голас да тых, каго гэты сьвет адкідае, а калі неабходна, зможаш стаць самааданым ахвярапрынашэньнем гэтага парадку. Ты здолееш так рабіць, бо, у адрозьненьні ад мысьляроў гэтага часу, ты будзеш разумець, што дадзены парадак – зусім не неабходны. Таму, насуперак сьмерці, ты зможаш шчодра і безінтарэсоўна ствараць.

**Дэканструкцыя**

Гісторыя, якая нам дадзена і якая ня мае канца, – гісторыя збаўленьня, – складаецца, па-сутнасьці, зь вялізарнага мноства гісторыяў. Усе яны пачынаюцца аднолькава: разбурэньнем знутры манатоннага аповеду пра тое, якім чынам наш сьвет мацуе сваю бясьпеку і трываласьць за кошт ахвяраў. Для ўсіх нас ягоны пачатак знаходзіцца ў новай гісторыі прызнаньня свайго ўдзелу ў "памылцы", прызнаньні свайго быцьця як усе, а потым – вандроўкі самымі разнастайнымі шляхамі ладзіць вясельны банкет Ягняці. Той банкет, на які, паводле эвангеліста Мацьвея, мы ўсе – добрыя і кепскія, – запрошая прыйсьці такімі, якія мы ёсьць. Важна, каб мы ўсьведамлялі, што падзея, на якую мы шчыра і бескарысьліва запрошаныя, – гэта вясельны банкет. Таму з радасьцю трэба прыняць дармовы вясельны строй і не клапаціцца і хваляваца, ці вартыя мы таго. Бо іншае б азначала, што мы думаем так, нібы нас паклікалі на суд, які зьдзяйсьняе той, хто недалюблівае нас, а ня той, каму мы падабаемся. Чалавек, прагнаны са сьвята, – гэта засяроджаны на сабе і заклапочаны нагодай, на якую яго паклікалі, агаломшаны скандалам самога сябе.

Таму галоўная гісторыя, якую мы пакліканыя апавядаць у мностве самых розных формаў, – гэта гісторыя таго, як мы перасталі быць гвалтоўнымі ахвяразабойцамі Ягняці і, замест таго, пачалі ствараць дробныя, ледзьве бачныя або істотныя знакі жыцьця Ягняці, намёкі Божага клопату і любові да тых, кім пагарджаюць, каго пазбаўляюць быцьця, хто ў вачох сьвету ня варты нічога. Па-сутнасьці, мы толькі тады свабодныя рызыкнуць удзельнічаць у гэтым праекце гісторыі бязь сьмерці, калі мы ў першую чаргу дастаткова свабодныя ад самазасяроджанасьці на тым, ці добрыя мы ці не. Бо мы спадзяемся на безінтарэсоўную шчодрасьць Таго, хто заклапочаны ня тым, што мы ўчынілі, але тым, кім мы можам – бо нам дадзена – стаць. Па-другое, мы можам стаць свабоднымі любіць тое, што марнасьць гэтага сьвету (яна выглядае як здаровы сэнс, разважнасьць, моцныя аргумэнты) абвяшчае неістотным толькі калі мы згаджаемся стаць такімі ж няўпэўненымі і ўразьлівымі, як і тыя, каго мы вучымся любіць і ім служыць.

Ты збаўлены? Адзіны рэальны адказ на такое пытаньне – не адказваць нічога, не спусташаць багацьце апошняга суду, калі будзе бачная дзівосная разнастайнасьць вясельнага банкету Ягняці. І мы нават можам зьдзівіцца, калі распазнаем у дробных дэкарацыях нешта зробленае ўласнымі рукамі. Іншымі словамі, мы можам дазволіць сабе быць уцягнутым у гэтую дзіўную, перавернутую гісторыю, якая пачынаецца з разуменьня таго, што я памыляўся, і якая старанна выкарыстоўвае здарэньні, знакі, прыклады, каб узгадоўваць стваральнае ўяўленьне. Гісторыя нашага актыўнага ўдзелу ў перамяненьні манатоннай гісторыі гэтага сьвету пачалася сьмерцю і ўваскрасеньнем Ісуса. Гэтая гісторыя – тое, што мы называем Царквой, і па гэтае прычыне збаўленьне сутнасна зьвязанае з Царквой, яе тэкстамі і таінствамі. Гэта – ашаламляльная гісторыя, якую мы часта ўспрымаем лёгкадумна, бо так слаба ўяўляем сабе, што можа значыць стваральна выкоўваць гісторыю, якая ня мае канца.

.

© James Alison.

Ангельскі тэкст (http://www.jamesalison.co.uk/pdf/eng18.pdf) быў апублікаваны ў 1996 г. у часопісе *Priests and People* (цяпер – *The Pastoral Review*, http://www.thepastoralreview.co.uk), Лёндан.